# А ў нас сення Масленка

**Скамарох 1**. Гэй, весялей збірайцеся, людзі!
Зараз свята да нас прыбудзе!
**Скамарох 2.** Ад усіх дзвярэй, ад усіх варот
Збірайся хутчэй, спяшайся народ!
**Скамарох 3**. Спяшайся на свята, што будзе!
Вясна з Зімою на свята прыбудзе!
**Скамарох 4.** І там пакажуць вам цуд,
Як Зіма з Вясною будзе весці суд!
**Скамарох 1**. Зіма са снегам, Вясна са смехам
Сыйшлі з дарожкі, бяруцца ў рожкі!
**Скамарох 2**. Вясну сустракаем, Зіму адпраўляем!
У нас сёння –
**Усе.** Масленіца!
***Музыка. Танцавальны праход скамарохаў.***

***На сцэну выходзяць вядучыя.***

**1в.** Масленіца ( Масленка, Сырніца ) – старажытнае перадвеснавое свята, звязанае з культам прыроды. Царква прыстасавала свята да апошняга тыдня перад вялікім пастом.

**2в.** Назва “ Масленіца “ паходзіць ад таго, што на працягу ўсяго тыдня дазвалялася есці кароўе масла. У буднія ж дні ўжывалі канапляны або льняны алей.

**1в** .Найбольш шумна і разнастайна святкавалася Масленіца на Русі. Гэта было вялікае народнае гулянне, да якога нават Пётр 1 адносіўся з павагай. Свята працягвалася цэлы тыдзень. Кожны дзень меў сваё прызначэнне і назву.

**2в**. Панядзелак – “Сустрэча”. Робяць Масленіцу і прыбіраюць яе.

**1в**. Аўторак – “Зайгрышы”. Дзяўчаты і хлопцы каталіся на санках, выглядаючы сабе жаніхоў і нявест.

**2в**. Серада – “Лакамка”. Цешчы запрашалі зяцёў на бліны.

**1в**. Чацвер – “Разгул”. Каталіся на санях, выконвалі розныя абрады.

**2в.** Пятніца – “Цешчыны вячор кі”. Зяці частавалі блінамі сваіх цешч.

**1в.** Субота – “Залоўкіны пасядзелкі”. Маладая нявестка запрашала ў госці сваякоў.

**2в**. Нядзеля – Провады Масленіцы. На кастры спальвалі ляльку-Масленіцу, што сімвалізавала сабой адыход зімы.

**1в.** На Беларусі дні Масленіцы праходзілі даволі сціпла. Святкаванне звычайна пачыналася ў чацвер, але ў ім захаваліся асноўныя абрады свята.

**2в**. Катанне на конях некалькі разоў вакол вёскі. Гэта, на думку старажытных людзей, дапамагала сонцу зрабіць гадавы круг, паскорыць надыход вясны.

**1в**. Распальванне кастроў таксама прасякнута глыбокім сэнсам. Часцей за ўсё іх палілі на ўзвышшы, каб аб’яднаць зямны агонь з нябесным – сонцам – і паскорыць надыход цяпла.

**2в**. На Беларусі бытаваў і сямейны звычай : у апошні дзень Масленіцы прасіць прабачэння адзін у аднаго за крыўды, грахі.

**1в**. Ну, але як кажуць, лепш адзін раз убачыць, чым шмат разоў пачуць.

**2в.** Мы сягоння ладзім свята,

Клічам госцейкаў у хату.

Той вячорак нашых варты,

Хто сябруе з песняй, з жартам.

***Песня " Чаму ж мне не пецъ"***

*Беларуская хата…*
*Гаспадары, прыбраныя па-святочнаму, завіхаюцца ля стала, на якім бліны ды аладкі, сыр, масла, розныя ласункі.*

**Гаспаыня**: Глянь, гаспадарок,у акно: да нас, мусіць, Масленіца ідзе, вясну-красну з сабой нясе.

**Гасп-р**. А мая ж ты, Паўлінка,ці хопіць там аладак, блінцоў, абаранкаў, каб сустрэць Масленіцу?

**Г-ня**. Хопіць, Васілька, хопіць, не турбуйся. Лепш да дзвярэй ідзі шпарчэй, каб сустрэць дарагіх гасцей.

**Госці:**

1.Гаспадары, дзверы адчыняйце

Масленіцу сустракайце!

**Га-ня.** Калі ласка, у хату!

**Г-р.** Падыходзьце бліжэй да нас, запрашаем у госці вас.

**2- госць.** Ходзіць Масленіца з чародамі,

Не запросіш-   падапрэ дзверы калодамі.

**З-ці** ( паказвае калоду) Гляньце, людзі, наша калода рагоча. Яна сыру, масла,  блінцоў хоча.

Гас- ня. Трэба гасцям дагадзіць і на лавы пасадзіць.

**Гас-р**. Калі ласка, госцейкі, сядайце ды вакол сябе паглядайце.

Вось, паважаныя, мы вас чакалі,

Свята без вас не пачыналі

**Гасп-ня.** На нашым свяце не будзе часу сумаваць.

На свяце гэтым трэба

Спявць, смяяцца, танцаваць.

***Песня "Прывітальная"***

1. Гаспадарочкі, ці вы ў вокны заглядалі,
   Масленіцу ці чакалі?

**Га-р**:  Яшчэ як чакалі.

**Г-ня:** Па вясне, па сонейку сумавалі.

1. Дык навошта сумаваць, трэба Масленку пазваць!

**Гаспадары**:  Прыйдзі,Масленка, хутчэй

Ды парадуй усіх людзей.

**Масленка:**  Іду! Іду!

Добры дзень,  шаноўныя гаспадары ( кланяецца ім)

Добры дзень, шаноўныя госці ( кланяецца)

Доўга я гэтай сустрэчы чакала

З цеплага краю да вас завітала,

Там сонейка бачыла, з ім размаўляла,

Яно  з ластаўкай першай прамень вам паслала

**Госці:**  Дзякуй.

**Масленіца** : А вось гэтае сонейка чароўнае. На кожным праменьчыку скорагаворка. Хто прачытае сваю скорагаворку хутка і выразна, той і будзе пераможцам.

4. З вяселай Масленіцай усіх вітаем!

Саху, барану шукаем.

5. ( сее на ўсіх пшаніцай)
   Сей пшаніцу на ўсю руку,
   Калі масленіца ў маладзіку.
6. Ваша застолле- наша калодка,
   Няхай будзе салодка.

4 Усім вам жадаем спрыяльных дзянечкаў
Каб раслі памідоры ды агурочкі
5. Хай у вашай працы дапаможа Бог
Каб урадзіла і жыта , і гарох.
6.Каб і ў хаце, і ў полі ўсе удавалася.
1. А яшчэ мы вам скажам, гаспадарочкі,
Што сення каталіся на санках і вазочках.
2.Каб хутчэй прыйшлі да нас цеплыя дзянечкі
Мы пракаціліся з канца ў канец
Каб рос добры лен- даўгунец.
**Г-ня.** Як слаўна, госцекі вы ўсе зрабілі.
Нашых добрых звычаяў ды не забылі.
**Масленіца.** Пра мяне мо песню маеце,
Дзе Масленку ўслаўляеце.
**Госці**. Маем.( водзяць караго, спяваюць)

1. У нас сення масленка, прыляцела ластаўка.
   Крыламі махнула, прамяні цяпла спіхнула.
2. У нас сення масленка, прыляцела ластаўка.
   Села на страсе, кідала масла пакрысе.
3. У нас сення масленка, прыляцела ластаўка.
   У вокны зазірала, моладзь выклікала.
4. У нас сення масленка, прыляцела ластаўка.
   А мы ў полі бывалі, чучала зімы такавалі.
5. У нас сення масленка, прыляцела ластаўка.
   Мы бліноцоў- аладак навыпякалі.
   Ды к вам у госці завіталі.

**Г-р**. Д зякуй вам за песню карагодную.

Сядайце ды з дарогі адпачывайце.

**<u>Г-ня.</u>** Каб вы ў нас не сумавалі,

Трэба, каб загадкі адгадалі.

**Загадкі гасцей:**
1. Белая кабыла усе дровы з’ела. (Печ.)
2. Вадкае, а не вада, белае, а не снег. (Малако.)
3. Без кліноў, без капытоў, само падыходзіць. Ніхто яго не трывожыць. (Цеста.)
4. У рубашцы радзіўся, а голы ходзіць. (Клінковы сыр.)

*Пасярод двара стаіць гара, спераду- вілы, ззаду- мятла.*

**Г-р**. І яшчэ адна загадка. Свае дзіця не забыла і чужое накарміла.

**Масленіца.** *А хто двума бадаецца, чатырма ходзіць, адным мух ганяе?*

*( за дзвярыма чуецца мычанне каровы)*

**Г-ня**. Ой, здаецца, і сапраўды мычыць карова. Пайду адчыню дзверы.

*( уваходзіць кароўка, мычыць, бадаецца, брыкаецца, танцуе)*

**Г-ня**.*( абдымае кароўку)*Цябе ў масленку будзем успамінаць, аб табе добрае казаць.

1. А цяпер, гаспадары, дазвольце пагуляць,
   Цяжкую калодачку пацягаць.

**Г-р**. Калі ласка, гуляйце. Калодачку пацягайце.

3.— Хлопцы, каціце хутчэй сюды калодку! Зараз пабачым, ці ж гэта маладая гаспадынька ўмее гатаваць, гасцей частаваць. Можа, яна з тых, пра якіх гавораць: «І шыла, і мыла, і прала, і ткала — а ўсё языком»?

Госці і гаспадары ўтвараюць круг. Хлопцы падкатваюць да ног гаспадыні калодку і загадваюць загадку:
**2 госць:**
— Што расцілі, збіралі, таптaлі, ткалі ды на стол заслалі? (Абрус.)
-- Ой, стамілася цягаць, магу выкуп даць.
Гаспадыня адгадвае загадку, сцеле на калодку сурвэтку, ставіць

прыгатаваныя ёю стравы. Лічыцца, што яна ад хлопцаў-гасцей «адкупілася».

**Масленіца** Чую пах смачных, цеплых блінцоў. Мабыць, наша гаспадыня ўжо гатова пачаставаць нас блінцамі.

**3**.Я бліны б уплятаў ды галавою матляў!
**4. госць:**
— Дзіва што! Кажуць жа, што на мазаны блін і кот па-другому глядзіць!
***Песня " Ой, бліны, бліночкі..."***

**Г-ня.** Бліны- галоўны пачастунак на Масленіцу, таму што яны вельмі падобныя на сонца, якому людзі вельмі рады пасля зімы. Я хачу вас таксам пачаставаць блінамі, але спачатку адгадайце, колькі бліноў у мяне ў гэтай горцы.

Так, у мяне сем бліноў, колькі дзен у Масленіцы.

**Масленіца.** Прапаную наступны конкурс.Кожная каманда атрымае па стосіку бліноў.Ераможа тая каманда, якая першая справіцца з пачастункам.(5+5)

**Гаспдыня.** Блінцоў наеліся, а ў мяне есць малачко, запіць.Вось вам па збаночку малачка і саломка. Якая каманда першая вып'е малачко, тая і пераможца.( 3+3)

**Г-р.** Увага! Я буду расказваць пра тую рэч, якая схавана ў маім кошыку, а вам неабходна яе адгадаць.

**Масленіца.** Скажыце, што нагадвае абруч? Правільна, сонца. А на Масленіцу вялікая пашана была тым рэчам і дзеянням, якія нагадвалі сонца. І бліны круглыя ды жоўтыя. Нават на конях ездзілі вакол вескі некалькі разоў, каб акрэсліць, пазначыць кола.Наступны конкурс будзе такі: запрашаюцца 2 супернікі, якія будуць круціць абручы- хто даўжэй, той і выйграў.
**Скамарох 1**. А вось і паважаны госць-мядзведзь прачнуўся
Ды на свяце апынуўся.
**Скамарох 2**. Ну-ка, Мішанька, пакланіся людзям.
Мядзведзь кланяецца.
**Скамарох 3**. А зараз пакажы, як нашы вучні да ўрокаў рыхтуюцца
*Музыка. Мядзведзь паказвае.*
**Скамарох 4**. Мішанька, а як нашы дзяўчынкі прыбіраюцца?

Музыка. Мядзведзь паказвае.
**Скамарох** 1. Мішанька, а чым нашы дзеці на перапынках займаюцца.
**Скамарох 4**. Вучаны Мішка не па кніжках,
Але прэміі мае…Вось табе яшчэ адна!.
Даюць яму збан з мёдам.

**Гульня**

1. У апошні дзень на масленіцу, звычай быў такі:
Прасілі прабачэння і дзеці, і бацькі.

2. Бацькі за тое, што злавалі, што мала дзетак шкадавалі
А дзеткі, што бацькоў не шанавалі.
3. Атрымаўшы прабачэнне, танчылі, спявалі
. Вясну з сэрцам лёгкім сустракалі

**Гаспадар**. Каб не парушыць звычай гэты
Нам трэба не забыць
**Гаспадыня**. За ўсё, што дрэннага зрабілі
Прабачэння папрасіць

**Гаспадар.** Людзі добрыя, не злуйце,
**Усе** Адзін аднаго - даруйце!
**-Гаспадыня**. Гэта вельмі добры старадаўні звычай, трэба пра яго памятаць. Давайце і мы абдымемся і папросім адно аднаго даравацъ крыўды, не крыўдзіцца.

6. Усе Вясну чакаем мы,
Цяжка стала ад Зімы.
5. Толькі Вёсенька спазнілася,
Мабыць, дзесьці заблудзілася.
4. Зіма нам надакучыла, хочацца Вясны.
3. Каб птушачкі прыляцелі, каб лугі зазелянелі
Усе. Каб расцвілі цвяточкі, каб зацвілі садочкі!

***Гучыць музыка. З'яўляецца Зіма..***
**Зіма**. Хто мяне тут праганяе
Хто Вясну ўжо чакае?
Ні за што і анікому я пакуль квітнець не дам,
Ні гарошку лугавому, ні гародам, ні садам.
Я над імі гаспадыня, мне раўні цяпер няма.

Хто не ведае – глядзіце, гэта я кажу – Зіма!
**Гаспадар**..

Ведаю я – Зіма не жартуе , а грозіць

У момант адзін нас ўсіх замарозіць.

**Гаспадыня**.. Хопіць нам яе баяцца
А табе, Зіма, злавацца!

**Госці.**1. Сцюжу каб тваю суняць,
Зараз будзем мы гуляць!
2. Вы, шаноўная васпані,
Пагуляйце разам з намі!
3.. Каб не мелі на нас злосці,
Каб жылі у весялосці
4. Сумных думак не трымалі
5. Ды аб нашым шчасці дбалі.
6. А пад бомаў перазвон
Прынясем для вас мы трон!
выносяць трон. Зіма сядае.

**Зіма.** Бачу, што я вам надакучыла. Але ж я старалася, гурбы снегу намятала, каб вам весела было. Ці ж не хораша вам было зімой? У якія гульні вы зімой гулялі?

**Гульня ў снежкі**

**Гападар**. А зараз мы правядзем гульню **"Хто хутчэй апранецца".**

Бываюць у нас маразыы ды завеі, і, каб не замерзнуць, трэба цепла апранацца.
**Зіма.** Дзякуй, шаноўныя за сустрэчу, за тое, што мае традыціі і абрады памятаеце і захоўваеце, за тое, што шчодра і весела мае провады святкуеце. Вялікі дзякуй вам, людзі. А зараз надыйшоў час
Вясну-красну сустракаць.
**Музычна –харэагрфічная кампазіцыя "Таўкачыкі".**
**Зіма**. Вясну з прыходам я вітаю!
І перад тым, як трон аддаць,
Хачу я зерне перадаць.
Бяры зярно і засявай
Палёў шырокія абшары!
Хай новы дзень з прыбыткам будзе,

Прыносіць шчасце, радасць людзям!
***Музыка. Зіма перадае Вясне чашу з зернем.***
**Вясна.** Я прыйду да дзевачак у таночак,
Прынясу прыгожанькі вяночак,
Прынясу ясныя дзянёчкі,
Чыстыя дожджычкі,
Зялёныя травы, чырвоныя кветачкі.
***Пачынае акідваць усіх зернем.***
Будзьце багатыя, як зямля,
Будзьце здаровыя, як вада.
Няхай ваша хата
Будзе заўсёды багата!
**Зіма**. Хай цёплы дзень смялей ступае-
Табе я месца саступаю.
Хай новы дзень з прыбыткам будзе,
Нясе вам шчасце, радасць, людзі!
Ну, а зараз, усе бывайце,
Ліхам вы не памінайце.
Што не так, дык выбачайце,
Вясну святам сустракайце!
**Скамарох 1**. Гэй, дарогу дай!
**Скамарох 2**. Расступіся народ:
**Скамарох 3**. Адыходзіць Зіма
**Скамарох 4**. Ад нас на год!

***Гульня " Ручаек"***

**Гаспадар:** Каб ў госці да нас вясна завітала, трэба нам пудзіла разам спаліць!

Збірайся, народ, каля масленкі ды ўсё старое з сабой нясі: думкі, рэчы, няўдачы і гэтак далей.

**Дзяўчынкі:** А для чаго ж гэта ўсё з сабою браць патрэбна?

**Гаспадыня:** Як для чаго? Каб у зіме сыходзячай з зямлі ўсё гэта засталося і каб ў вясну нам добра жылося.
**Вясна.** Пара, сябры, нам з вамі запаліць вогнішча, каб зямелька сагрэлася, каб сонейка свяціла- багацце прыносіла. Гэй людзі, збірайцеся, птушкі, злятайцеся – час надыйшоў карагод веснавы завесці!

**Дзяўчына1**: Ну дык штож мы стаім! Зайграйце, музыканцейкі! Пойдзем хутчэй пудзіла паліць ( паляць пудзіла, водзяць карагоды)
Музыка.
**Скамарох 1**. Настае зараз гадзіна
**Скамарох** 2. Нам усім патанцаваць
**Скамарох 3**. Веснавыя песні ўспомніць
**Скамарох 4**. Ды ў гульні пагуляць.
***Гучыць музыка.***
***Пачынаецца канцэртна-гульнёвая праграма.***
Пасля заканчэння на сцэне з'яўляюцца «Скамарохі»
1. Мы прыйшлі да вас пажадаць дабра
Ад усёй душы, як сваім сябрам.
2. Каб прынёс год новы вам
Дабрабыт і плён,
3. Многа радасці, веру светлых дзён
4. Няхай збудзецца, што пажадаецца,
Што задумана – прыдбаецца.
5 Дзякуй вам за добры прыём
6. Праз лета і восень і зіму
Ізноў да вас прыйдзём!
Усе Усяго вам добрага!